# Немагчыма адарвацца

**Яўген Скібскі**



Зразумела, наўрад ці буду вельмі арыгінальным і адзінокім, адзначаючы высокую якасць паэзіі Андрэя Хадановіча. Дастаткова сказаць, што ён з'яўляецца лаўрэатам прэміі імя Наталлі Арсенневай гэтага года за зборнік «Школа травы». Абсалютна заслужаная перамога, улічваючы яшчэ і тое, як складана было журы — іншымі намінантамі аказаліся дзве таленавітыя паэтэсы — Вольга Гапеева і Данута Бічэль-Загнетава!

Маё знаёмства з творчасцю Хадановіча адбылося адносна нядаўна. Прашу не кідаць каменне ў сціплага аўтара гэтага тэксту, але ж яшчэ якіх пару гадоў таму я лічыў, што сучаснай беларускай літаратуры не існуе. Дзякуй Богу, штуршкі лёсу пераканалі мяне ў адваротным. Цяпер я знаходжуся ў цвёрдай упэўненасці, што Беларусь — краіна лепшых пісьменнікаў. Ад вершаў Андрэя Хадановіча я адчуў ці не самы вялікі шок (у добрым сэнсе). І гэтыя мае словы трэба ўспрымаць з улікам таго, што я ўжо не прышчавы юнак, схільны да парасячага захаплення.

Можна доўга распавядаць пра розныя жанры, у якіх ствараe вершы Андрэй. І як тут не згадаць «Нататкі таткі»! Далёка не кожны аўтар здольны напісаць годную дзіцячую кніжку.

Можна захапляцца цудоўнымі перакладамі, напрыклад, майго ўлюбёнага Маякоўскага. Дарэчы, калі я перакладаў «Флейту-позвоночник», наўмысна не глядзеў Хадановічаў пераклад — баяўся ўплываў. Майстэрства яго на гэтай ніве было пацверджана прэміяй імя Карласа Шэрмана (2017) за пераклад вершаў Шарля Бадлера.

Можна таксама распавесці пра папулярызацыю паэзіі і работу з маладымі аўтарамі. Думаю, шмат хто з сучасных беларускіх паэтаў можа назваць Андрэя Хадановіча хросным бацькам у творчасці.

Можна шмат што сказаць і пра актыўную грамадзянскую пазіцыю Андрэя, і праўдай будзе тое, што многія лічаць яго не толькі цудоўным паэтам і перакладчыкам, але і сапраўдным маральным арыенцірам.

Але акрамя ўсяго гэтага я маю і асабістыя крытэрыі ацэнкі якасці паэзіі Хадановіча. І яны для мяне самыя істотныя: чытаючы, немагчыма адарвацца, а калі кніга заканчваецца — цягне пісаць вершы!

